САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 СТУДЗЕНЯ 2012 г.
ПЯТНІЦА
№ 17
(27132)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.




## УРУЧАНЫ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў учора дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны, перадае БЕЛТА.**

У спісе ўзнагароджаных 68 чалавек. Гэта людзі, удастоеныя ўзнагарод за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, асабісты ўклад у развіццё аграпрамысловага і будаўнічага комплексаў, аховы навакольнага асяроддзя, адукацыі, гандлю і спорту, сродкаў масавай інфармацыі, мытных органаў, іншых сфер дзейнасці.

«Ваша праца праслаўляе і ўзвялічвае краіну, дапамагае пераадольваць цяжкасці, рабіць магчымым тое, што яшчэ ўчора здавалася непераадольным. Дзякуючы вам і мільёнам іншых працаўнікоў развіваецца наша краіна, багацейшым і больш камфортным становіцца жыццё беларусаў», — адзначыў прэм'ер-міністр у час урачыстай цырымоніі.

Медалямі «За працоўныя заслугі» ўзнагароджана вялікая група работнікаў сельскай гаспадаркі.

За шматгадовую творчую работу, асабісты ўклад у развіццё беларускай журналістыкі дзяржаўных узнагарод і Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удастоена група работнікаў электронных і друкаваных СМІ.

Дзяржаўныя ўзнагароды ўручаны групе работнікаў устаноў культуры. Сярод узнагароджаных прадстаўнікі вядомых творчых калектываў краіны — Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, Магілёўскага абласнога драматычнага і Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатраў. «У развіцці культуры спалучаюцца глыбінныя асновы нацыянальнай духоўнасці і дзяржаўная палітыка, якая яе захоўвае, падтрымлівае і ўзнімае да вышынь прафесійнага мастацтва», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Ганаровых званняў «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» і «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь», Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удастоены трэнеры і спартсмены-інструктары нацыянальных каманд у розных відах спорту. «Ва ўзнагароджанні спартсменаў увасабляецца стаўленне краіны да спорту, здаровага ладу жыцця і прызнанне выдатных якасцяў узнагароджаных», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Узнагароджаны і работнікі, якія ўнеслі значны ўклад у вырашэнне прыродаахоўных праблем. «У Беларусі ахове прыроды заўсёды ўдзялялася вялікая ўвага, захаваны ўнікальныя прыродныя комплексы, ландшафтная і біялагічная разнастайнасць. З кожным годам павялічваюцца плошчы ахоўных тэрыторый. Гэта залог таго, што хараство і багацце беларускай прыроды будуць здабыткам многіх пакаленняў нацыі», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена рэктарам вышэйшых навучальных устаноў краіны. Уручаючы ўзнагароды, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што гэта заслужаныя людзі, паважаныя ў сваіх калектывах, вядомыя вучоныя. «Карыстаючыся выпадкам, я хачу павіншаваць вас не толькі з узнагародай, але і з Днём беларускай навукі, які ўся краіна будзе неўзабаве адзначаць. Прыміце віншаванні, таму што вы з'яўляецеся не толькі прадстаўнікамі ўстаноў адукацыі, а і паважанымі, вядомымі ў краіне і за яе межамі вучонымі. Вашы веды і педагагічны талент — важнейшыя інвестыцыі ў будучыню нашай дзяржавы. Беларускай эканоміцы патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты, энергічныя бізнэсмены, мудрыя кіраўнікі, таленавітыя вучоныя», — сказаў прэм'ер-міністр.

## НА БЯРЭЗІНСКІ ЛЁД!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З адкрыццём фізкультурна-аздараўленчага цэнтра ў моладзі горада Беразіно з'явілася любімае месца адпачынку — адкрыты каток. Тут вялікі выбар канькоў сучасных мадэляў. Надзея ГАЙДУК, Іван ЛІСАВЕНКА, Яўген ЦІМУТА і Юрый ЛУЧАНОК (на верхнім здымку) дзеляцца ўражаннямі пасля чарговай пробы лёду.



### МАСАВАЯ ЗАЛІЎКА КАТКОЎ ІДЗЕ І Ў СТАЛІЦЫ

У планах сталічных улад — заліць 115 каткоў і паставіць 33 хакейныя «каробкі». Пра гэта паведаміў начальнік арганізацыйна-масавага аддзела ўпраўлення фізічнай культуры і спорту Мінгарвыканкама Сяргей Юхнавец.

Сёлетняя зіма доўга не радавала аматараў пакатацца на каньках. Так, цэнтральны адкрыты каток на Кастрычніцкай плошчы, дзе летась лёд быў ужо ў снежні, пачаў сваю працу 21 студзеня. Ад гэтага, безумоўна, выйгралі крытыя каткі, на якія прыйшлася асноўная маса наведвальнікаў. Сёння ў Мінску і бліжэйшым наваколлі такіх месцаў 5 — на Нямізе, у Раўбічах, у Сілічах, у Мінскім лядовым Палацы спорту і на «Мінск-Арэне».

Па словах Міхаіла Харошкі, інжынера па інфармацыйным абсталяванні сезоннага мабільнага катка на Нямізе, у гэтым годзе людзей і сапраўды больш.

— Асабліва добра гэта было заўважна падчас школьных канікулаў, — расказвае Міхаіл. — Цяпер жа днём вучні ў школе, таму людзей не вельмі шмат, народ прыходзіць бліжэй да вечара. Але тое, што колькасць наведвальнікаў павялічылася, усё роўна адчуваецца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

Надвор'е

## НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ — ДА МІНУС 29

**Даволі сур'ёзную порцыю холаду прынёс днямі ў Беларусь сібірскі антыцыклон, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

У пятніцу ападкаў ужо не прагназуецца, аднак на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень мінус 8—13 градусаў, па ўсходзе краіны — да 15 марозу. Не чакаецца ападкаў і ў суботу, і ў нядзелю, а маразы ўначы ўзмоцняцца да мінус 13—20 градусаў, у ноч на 29 студзеня на ўсходзе — нават да 27 градусаў ніжэй за нуль. Удзень на выхадныя будзе мінус 8—15 градусаў, ва ўсходніх раёнах часам да 16—18 марозу.

Не зменіцца характар надвор'я і ў першай палове наступнага тыдня. Да першага лютага ўключна ападкаў не будзе і стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы мінус 16—23 градусы, па ўсходзе краіны — да 24—29 марозу; удзень — мінус 10—17, на ўсходзе — да мінус 20 градусаў. Спецыялісты гідраметцэнтра падлічылі, што такі тэмпературны фон апошніх дзён студзеня будзе ажно на 8—12 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, гэты маларухомы сібірскі антыцыклон працягне гаспадарыць на тэрыторыі Беларусі і ў першай пяцідзёнцы лютага, калі будуць трымацца моцныя маразы. Даволі холадна на выхадныя будзе і ў Мінску. У ноч на суботу чакаецца мінус 17—19, у ноч на нядзелю — каля 20 марозу; удзень — мінус 12—14 градусаў і без ападкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### МЗС РЭКАМЕНДУЕ БЕЛАРУСАМ АДМОВІЦЦА АД ВЫЕЗДУ ЗА МЕЖЫ КУРОРТНЫХ ЗОН ЕГІПТА

**Аб гэтым учора на брыфінгу паведаміў прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных, перадае БЕЛТА.**

Цяпер абстаноўка ў Егіпце прадаўжае заставацца напружанай. У сувязі з гадавінай рэвалюцыі прагназуецца абвастрэнне сітуацыі, у краіне адчуваюцца перабоі з бытавым газам, бензінам, а ў некаторых раёнах і з хлебам. «Усё гэта ў любы момант можа справакаваць масавае нездавальненне і чарговыя акцыі пратэсту», — адзначыў Андрэй Савіных.

### ПА КВІТОК — НЕ ТОЛЬКІ Ў КАСУ

**На Мінскім чыгуначным вакзале ўсталявалі тэрміналы па продажы квіткоў на прыгарадныя цягнікі.**

Пяць тэрміналаў, адзін з якіх размешчаны ў галоўным фае будынка вакзала, а астатнія — у зале прыгарадных кас, як адзначыў начальнік Мінскага чыгуначнага вакзала Уладзімір Грыгаровіч, пакуль не карыстаюцца асаблівым попытам у пасажыраў.

— Гэтай навінцы ўсяго некалькі дзён (адзін з тэрміналаў пакуль яшчэ трэба настроіць), людзі яшчэ не звыкліся.

Аплачваць квіток у тэрмінале можна з дапамогай пластыкавай карткі любога банка. Тыя, у каго з сабой толькі наяўныя грошы, купіць квіток праз тэрмінал не змогуць. Пасажыры, якія карыстаюцца льготамі на праезд, таксама павінны звяртацца толькі ў касы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### АДПОМСЦІЛА... МАШЫНЕ

**З сякерай на «Мазду» выйшла жыхарка Жлобіна пасля таго, як яе няпоўнагадовага сына разам з такім жа сябрам чарговы раз затрымалі супрацоўнікі ДАІ.**

Хлопцы неаднаразова каталіся ў аўто, якое належыць бацьку сябра. Як расказаў начальнік аддзела ўпраўлення СК па Жлобінскім раёне Андрэй Сялягін, 40-гадовая жанчына некалькі разоў прасіла, каб сваяк сябра яе сына не дазваляў браць дзецям машыну, і нават папярэджвала, што пасячэ сродак перасоўвання. Нарэшце ноччу абяцанне было выканана. Страты, нанесеныя машыне, перавышаюць Br1,5 млн. рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ХАБАР, КАБ... НЕ ЗВОЛЬНІЛІ

**37-гадовы жыхар Смаргоні, займаючы пасаду на адным з мясцовых прадпрыемстваў, паабяцаў двум парушальнікам, што пераканае кіраўніцтва, каб іх не звольнілі. Але насамрэч, узяўшы паўтара мільёна рублёў, дапамагаць не збіраўся.**

Прараб, заспеўшы падначаленых за гультайствам, сказаў, што з імі цяпер развітаюцца. Пасля чаго рабочыя выйшлі праз брыгадзіра на «памочніка», які ўзяў грошы «ні за што». Верагодна, акрамя махляра, прыйдзецца адказваць па законе і брыгадзіру, які падазраецца ў падбухторванні да дачы хабару, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## НАРОДНЫЯ АПАВЯДАЛЬНІКІ

Формула ўдачы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Алесь БАДАК, Алена ГАНУЛІЧ, Віктар КАЗЬКО.

**Дзеля чаго наш конкурс апавяданняў ладзіцца? Па-першае, каб загучалі імёны новых людзей, якія хочуць пісаць па-беларуску, папаўняючы, магчыма, беларускую літаратуру. Менавіта гэтым крытэрыем заўсёды кіраваўся пісьменнік Віктар Казько, які быў вядучым конкурсу больш за дзесяць гадоў. І хоць летась конкурс ішоў не асабліва актыўна, менавіта з-за таго, што ўдзельнічалі сталыя і пастаянныя нашы аўтары, адкрыццё ўсё-такі адбылося. Адкрыццё маладога аўтара: Алена Ганулiч узяла, па-першае, шчырасцю напісанага, а па-другое — шчырасцю жадання выказваць свае пачуцці менавіта па-беларуску. Сціплая маладая жанчына ў сваім допісу прызнавалася, што доўга не адважвалася паслаць на конкурс сваё апавяданне, якое было напісана яшчэ ў сямнаццацігадовым узросце, але пяць гадоў чакала, пакуль аўтарка набярэцца смеласці заявіць пра сябе...**

«Звязда» сапраўды можа стаць кропкай, якая дае ўпэўненасць у сабе. У гісторыі нашага конкурсу такія выпадкі былі, калі людзі потым працягвалі займацца творчасцю больш актыўна і нават станавіліся аўтарамі кніжак. Як Міхась Зізюк, які сёлета атрымаў трэцюю прэмію. Прадпрымальнік з Навагрудка ўжо быў нашым лаўрэатам, але сёлета, акрамя таго, што нагадаў пра сябе ў «Звяздзе», выдаў дзве кніжкі. На жаль, ён не змог прысутнічаць на падвядзенні вынікаў у рэдакцыі — паехаў у камандзіроўку. Але паведаміў пра тое, што дзякуючы літаратурнай працы стаў «зоркай» у сваім горадзе, дзе праходзяць яго творчыя вечарыны.

Хочацца верыць, што наш конкурс — толькі пачатак і для Алены Гануліч, якая прыехала да нас з вёскі Варняны Астравецкага раёна, дзе жыве і працуе школьным псіхолагам.

— Хачу сказаць дзякуй галоўнаму рэдактару, што надрукавалі, і Віктару Апанасавічу, які рэкамендаваў маё апавяданне, за тое, што вы даяце магчымасць звычайным людзям з правінцыі рэалізаваць сябе, — сказала Алена Гануліч.

— Усе творцы, хто піша апавяданні, чытаюць газету «Звязда» і бачаць перад сабой нейкі ўзор, — адзначыў Віктар Казько. — І тут назіраецца апошнім часам не вельмі добрая тэндэнцыя: знікае непрыдуманасць. А конкурс «Звязды» заўсёды быў народным. Ён «браў» менавіта народнасцю гісторый, якіх не створаць літаратары, таму што часта ў іх творах няма жыццёвай асновы і адчуваецца штучнасць. А тут шматлікія мясцовыя людзі нешта распавядаюць з таго, што мела месца. Чым цікавы конкурс апавяданняў у «Звяздзе» і чаму ён патрэбны? Ён нешта абуджае. Абуджае якраз саміх апавядальнікаў. Ён каштоўны тым, што гэта амаль адзіная рэспубліканская газета, якая клапоціцца пра нешта мастацкае ў жыцці і вымушае чытачоў не забываць сваё роднае беларускае слова. Мне хацелася б, каб конкурс захоўваўся далей.

Будзе захоўвацца. Таму што ёсць людзі, якія чытаюць газету і сочаць менавіта за конкурсам апавяданняў! Але і для тых, хто проста час ад часу хоча прачытаць нешта для душы, мы працягваем і абвяшчаем новы этап — з новым вядучым. Віктар Казько перадаў свае паўнамоцтвы Алесю Бадаку, галоўнаму рэдактару часопіса «Нёман». Яны абодва пажадалі плёну ўсім нашым будучым аўтарам. І Алене Гануліч, пра якую мы больш падрабязна распавядзём у адным з наступных нумароў. Сапраўды ж цікава: чаму маладой жанчыне захацелася выказацца па-беларуску?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Хочаце стаць міжнародным чыноўнікам?

**Пазаўчора ў Маскве адбылося першае пасяджэнне Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі, якая выступае правапераемнікам Камісіі Мытнага Саюза. Старшынёй Савета быў назначаны намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Румас. Учора, ужо ў Мінску, ён пагутарыў з журналістамі.**

Як паведаміў Сяргей Румас, Калегія ЕЭК (першы наднацыянальны орган у складзе гэтай камісіі) пачне сваю працу 1 лютага. Ужо зацверджана, што туды будуць уваходзіць 23 дэпартаменты з агульнай колькасцю супрацоўнікаў да 600 чалавек. Гэты штат павінен быць сфарміраваны да 1 ліпеня 2012 года. Кіраўнік Савета ЕЭК нагадаў, што Рэспубліка Беларусь мае сваю квоту і ў бліжэйшы час на сайце ўрада будуць размешчаны патрабаванні да кандыдатаў у Калегію. «І любы чалавек, які валодае адпаведнай кваліфікацыяй, можа падаць заяўку на ўдзел у конкурсе ды паспрабаваць сябе ў ролі міжнароднага чыноўніка, — сказаў Сяргей Румас. — Заяўкі трэба будзе падаваць на працягу 10 дзён. Таму, як толькі інфармацыя на сайце з'явіцца, усе грамадзяне могуць звяртацца».

Між іншым, Калегія будзе разглядаць большасць пытанняў, аднесеных да ЕЭК, а таксама ёй будуць перададзены некаторыя нацыянальныя паўнамоцтвы — усяго каля ста да 2017 года. «Упершыню ў нашай гісторыі кіраўнікі трох краін згадзіліся з тым, што нацыянальныя ўрады перадаюць на добраахвотнай аснове паўнамоцтвы для прыняцця рашэнняў у наднацыянальны орган», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра.

Аднак поўнай уніфікацыі паміж эканамічнай палітыкай краін яшчэ не будзе. «Пакуль дамоў наконт узгаднення валютнай, фінансавай палітыкі не падпісана. Думаю, як мы і разлічвалі, Беларусь атрымае адтэрміноўку. Ад абавязковага продажу валютнай выручкі мы будзем адыходзіць не раней за 1 студзеня 2017 года», — заявіў Сяргей Румас.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## МЗС: РЭЗАЛЮЦЫЯ ПАСЕ — ЗВЫЧАЙНЫ ШАБЛОННЫ ДАКУМЕНТ

**У МЗС Беларусі лічаць рэзалюцыю ПАСЕ па Беларусі звычайным шаблонным дакументам, заявіў учора начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Андрэй Савіных, перадае БЕЛТА.**

«Прыняты даклад можна назваць звычайным шаблонным дакументам, напісаным на аснове сумніўных матэрыялаў і фальшывых абвінавачанняў з сеткі інтэрнэт. Аўтар (Андрэс Херкель, дакладчык ПАСЕ па Беларусі, лідар эстонскай дэлегацыі ў Савеце Еўропы. — **Заўвага БЕЛТА**) Беларусь не наведваў і па беларускую візу не звяртаўся. Яго не было сярод членаў парламенцкай дэлегацыі Эстоніі, якая наведала Мінск у кастрычніку мінулага года ў рамках міжпарламенцкага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння. Гэта шмат аб чым сведчыць», — сказаў Андрэй Савіных.

Акрамя таго, паводле яго слоў, ПАСЕ нават не запрасіла беларускіх парламентарыяў на разгляд гэтага опуса. «Гэта з'яўляецца відавочным доказам прадузятасці і ангажаванасці іх падыходаў. Ва ўсіх такіх дзеяннях апошнім часам мы бачым вельмі мала разумнага сэнсу, адсутнічае логіка. Яны хутчэй накіраваны на абслугоўванне кар'ерных, рэпутацыйных або палітычных патрэб саміх ініцыятараў», — дадаў прэс-сакратар беларускага МЗС.

## АЗАРАНКА — УПЕРШЫНЮ Ў КАР'ЕРЫ Ў ФІНАЛЕ AUSTRALIAN OPEN

### Віка згуляе супраць Шарапавай і паспрачаецца за званне першай ракеткі свету

У Мельбурне на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі Вікторыя Азаранка ўпершыню ў кар'еры выйшла ў фінал турніру Вялікага шлема. Для суверэннага беларускага спорту гэтая падзея адметная яшчэ і тым, што раней такая вяршыня нікому з нашых тэнісістак не скаралася. Праўда, у 1988 годзе мінчанка Наталля Зверава выйшла ў фінал Ралан Гарос, дзе прайграла знакамітай Штэфі Граф, але Наталля была выхаванкай яшчэ савецкай школы тэніса.

У паўфінале Вікторыя перайграла знакамітую бельгійку, экс-першую ракетку свету Кім Клійстэрс (6:4, 1:6, 6:3).

— Я быццам 100 кілаграмаў страціла. Такое адчуванне, быццам маё цела нічога не важыць! Але перамога таго каштуе. Я адчуваю неверагодны душэўны пад'ём, — падзялілася ўражаннямі пасля матча з Клійстэрс Вікторыя Азаранка. — Мне было цяжка пасля матча, але я змагла ўзяць сябе ў рукі. Гэта перамога духа. Я ганаруся тым, як я змагалася.

За ўдзел у паўфінале Australian Open Азаранка папоўніла свой рахунак на 1 мільён 150 тысяч аўстралійскіх долараў. У фінале, які пройдзе ў суботу, яна сустрэнецца з расіянкай Марыяй Шарапавай (лік іх асабістых сустрэч нічыйны — 3:3) . І будзе прэтэндаваць не толькі на 2 мільёны 300 долараў прызавых, але і на званне першай ракеткі свету, якое страціла Каралін Вазняцкі, прайграўшы на гэтым жа турніры Клійстэрс.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### «Прамая лінія»

**27 студзеня з 14.00 да 16.00** Камітэт дзяржаўнага кантролю праводзіць «прамую лінію», падчас якой будзе вывучана сітуацыя з прадстаўленнем паслуг сістэмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і выкананнем заканадаўства пры яе арганізацыі. Жыхары рэспублікі могуць паведаміць інфармацыю аб стане матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў дадатковай адукацыі і якасці паслуг, якія даюць цэнтры (палацы), гурткі, клубы, секцыі, студыі.

**Тэлефон «прамой лініі» — (017) 328 69 40.**




ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Мастра»

**Лот № 1.** Изолированное помещение — склад готовой продукции, инвентарный № 500/D-708009830, общей площадью 108,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 2В, пом. 9, принадлежащее ОАО «Мастра», стоимостью 735 884 000 (семьсот тридцать пять миллионов восемьсот восемьдесят четыре тысячи) белорусских рублей. В помещении располагается ООО «Би-амп» на основании договора аренды нежилых помещений от 09.09.2011 № 86, срок действия договора истекает 29.02.2012.

Минимальная величина первого шага составляет 5% стоимости имущества в размере 36 794 200 белорусских рублей.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,**
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 29.02.2012 в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться:**
**судебный исполнитель Есина Л.С., тел.-факс: 294 93 84 (86); 8 029 177 32 54,**
**судебный исполнитель Сидорок И.В. тел.-факс: 294 93 29 (86); 8 029 177 32 61,**
**ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.01.2012 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 8 350,00 | 1 чэшская крона | 435,36 |
| ▲ 1 еўра | 10 950,00 | 1 польскі злоты | 2 578,83 |
| 1 латвійскі лат | 15 716,17 | ▲ 1 расійскі рубель | 275,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 173,10 | 1 украінская грыўня | 1 039,40 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,3600 |
| 10 UAH | 37,7965 |
| 10000 BYR | 36,3158 |
| EUR | 39,8384 |

На свае вочы

# «МЫ ПЕРАСТАЛІ БЫЦЬ НУМАРАМІ, МЫ АТРЫМАЛІ ІМЯ»

## 27 студзеня — Дзень памяці ахвяр Халакосту

**З Кракава да Асвенцыма — кіламетраў 60. Снежныя пратадіны змяняюцца за акном голай зямлёй і шэрымі абшарпанымі будынкамі. Сёння Асвенцым, як і перад вайной, — невялікае мястэчка. Толькі калі перад вайной яно амаль не адрознівалася ад соцень іншых, то сёння — вядомае ва ўсім свеце. Сёння ў Асвенцыме жыве каля 400 тысяч жыхароў, шмат гаспадарчых і мэблевых крам, ёсць дзейная сінагога і сем касцёлаў. Музей у Аўшвіц-Біркенау штогод наведвае да аднаго мільёна чалавек.**


Ігар МАЛІЦКІ падчас наведвання лагера Аўшвіц-1.

Цэнтр дыялогу і малітвы ў Асвенцыме — адно з тых месцаў, дзе вывучаюць гісторыю Аўшвіца і дзе размешчаны атэль для начлегу падарожнікаў. Некалькі гадоў таму тут спыняўся Папа Бенядыкт XVI.

— Канцэнтрацыйны лагер зрабіў з Асвенцыма Аўшвіц, але сёння гэтае месца зноў жыве. Жыве як Асвенцым, — гаворыць супрацоўніца цэнтра сястра Мэры з Вялікабрытаніі. Кожны ранак гэтая жанчына ўдзельнічае ў службе за «ўсіх загінулых у Аўшвіцы» ў капліцы, размешчанай у цэнтры.

**НЕМАГЧЫМА МАЎЧАЦЬ**

Як зазначае дырэктар музея ў Асвенцыме Пётр Цывінскі, адны з найбольш актыўных наведвальнікаў сёння — моладзь. Штодзень сотні груп (еўрапейцы, амерыканцы, нават карэйцы) прыязджаюць сюды, каб на свае вочы пабачыць месца, дзе закатавалі больш за мільён дзяцей, жанчын і мужчын. У адной з залаў — вялізны пакой з адрэзанымі чалавечымі валасамі. Пасля таго, як у вызвалены Аўшвіц увайшлі савецкія войскі, у адным з баракаў было знойдзена 7 тон (!) чалавечых валасоў... Гэта тое, што нацыянал-сацыялісты не паспелі знішчыць.

...86-гадовы ўкраінец Ігар Маліцкі падыходзіць да брамы былога лагера і не можа стрымаць слёз. У яго захавалася лагерная кепка ў палоску, якую ён надзявае. Ігар Маліцкі закасвае рукаў і паказвае свой нумар, атрыманы ў канцэнтрацыйным лагеры. Уваходзіць у лагер і пачынае ўзгадваць.

Сюды, у Асвенцым-1, Ігара Маліцкага прывезлі восенню 1943 года. Мужчыне было 17 гадоў. Далей пададзены вытрымкі з успамінаў прафесара Маліцкага падчас наведвання ім лагера.

**ПРА СЕЛЕКЦЫЮ**

— Ва ўніверсітэце, дзе я выкладаю, часам мы праходзім тэму «Селектыўная зборка». Для мяне ж гэта азначае зусім іншае.

Раз на тыдзень, калі мы выстройваліся на пераклічку, ішоў хто-небудзь з урачоў і казаў, што сёння будзе селекцыя. Што гэта такое? Ідзе ўрач, тыцкае пальцам і кажа: «Косці», «косці», «косці»... А «капа» (лагерны наглядчык. — **Аўт.**) ідзе за ім і запісвае нумар. А вечарам пад'язджае машына і вязе ў Аўшвіц-Біркенау (другі асноўны лагер, вядомы пад назвай Аўшвіц-2), у крэматорый. Адбіралі тых, хто быў непрацаздольны...

**10 І 11 БЛОК АЎШВІЦ-1**

— Пасля каранціннага блока мяне перавялі ў 17-ы блок. Рабочы блок. Кожны ранак і вечар — Апэль (праверка): мы станавіліся, і нас пералічвалі. І кожны ранак па гэтай дарозе ў 10-ы блок вялі групу дзяўчат у цывільным адзенні — 10-15 чалавек. Я думаў, што туды іх водзяць і пасля выводзяць. Аказваецца, над імі праводзілі страшныя доследы. І яны, па сутнасці, адтуль не вярталіся...

У адным з пакояў выставы наш праваднік спыняецца каля так званай нормы ежы, якую атрымлівалі вязні: пад шклом — штучны кавалак хлеба і міска супу.

— Не, — спыняе нашу ўвагу Ігар Маліцкі. — Усё было нашмат горш: калі б нас кармілі сапраўды так, то мы былі б сытыя. Насамрэч жа мы атрымлівалі толькі маленькую частку з гэтага хлеба, а таксама палову міскі супу, паказанай тут...

**ПРА ЕЖУ**

— Усе стараліся атрымаць акрайчык: лічылася, што гэта сытней. Порцыі разразалі, а дзялілі наступным чынам. Адзін станавіўся спінаю да таго, хто наразаў. Той, хто наразаў, пытаўся: «Каму?» Той, які стаяў да яго спінаю, называў нумар зняволенага. Гэта каб не выбіралі самі сабе, а каб было па справядлівасці. У супе можна было знайсці гадзіннік, іголкі, пярсцёнкі...

Але есці хацелася ўсё адно. Таму елі і катоў, і сабак. Часам кажуць, маўляў, «ім нават каву давалі!» Каб вы ведалі: па каву мы стаялі, каб атрымаць не вадкасць, а тую кашу, якая заставалася на дне. А кава рабілася з жалудоў, нейкіх каштанаў. Гэта не было кавай, але так называлі.

**ПРА ДАПАМОГУ МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА**

— Пакуль ты мог працаваць — шанцы выжыць былі. Мы хадзілі на працу, і там нас падкормлівала мясцовае насельніцтва — палякі з прылеглых вёсак. Але як падкормлівалі? Яны не маглі даць ежу нам у рукі, яны проста пакідалі яе, маскіруючы, там, дзе мы працуем.

Памятаю, адзін хлопчык (на выгляд гадоў 14) кінуў нам звараную бульбіну. Эсэсаўцы спусцілі на яго сабаку, і яго гэты сабака так парваў, што кроў цякла па ўсім целе. Дзякуй Богу, што ён забраў пасля тую бульбіну і сабака не загрыз яго да смерці.

**ЗВЕРСТВЫ ФАШЫСТАЎ**

Ігар Маліцкі аглядае блок 17 і не можа спыніць слёз. Ён паказвае месца, дзе быў забіты да смерці яго сябар.

— Я стаяў на ўваходзе, а мой сябар — Толя (мой далёкі родзіч) дзесьці там ішоў і выпадкова натыкнуўся на эсэсаўца. Той яго стукнуў, Толя зваліўся, фашыст пачаў біць яго нагамі. Пасля падышоў яшчэ адзін, і ўдвух яны пачалі збіваць і палкай, і нагамі, і рукамі — і ў выніку забілі насмерць. Яму было 16...

**Ілья ЛАПАТО.** *Аўшвіц—Мінск.*

З 15 тысяч ваеннапалонных, якіх прывезлі ў канцэнтрацыйны лагер Аўшвіц-1, у жывых засталося толькі 96 чалавек. Згодна з планамі фашыстаў, у Аўшвіц павінны былі патрапіць 11 мільёнаў еўрапейцаў.

**УЗГАДВАЕ ВЯЗЕНЬ МІНСКАГА ГЕТА МІХАІЛ ТРЭЙСЦЕР:**

— Кожны лагер, які мне давялося наведаць, пакінуў у памяці дэталь, што ўрэзвалася ў памяць намёртва. Бухенвальд — абажурамі і элегантнымі дамскімі сумачкамі з татуіраванай чалавечай скуры, Майданэк — сталом для разбору ў пакоі крэматорыя для вырывання залатых зубоў і пошуку праглынутых каштоўнасцяў. Траблінка — пусткай: усё знішчана, і толькі вялізнае поле, на якім безліч валуноў (памяць пра знішчаныя яўрэйскія абшчыны) і вялізны холм з попелу і чарапкоў...

У Асвенцыме чамусьці запомнілася вітрына, за якой тысячы пратэзаў ног, рук і яшчэ Бог ведае чаго. І незразумела, навошта іх захоўвалі. Спалучэнне звярынай жорсткасці з чыста нямецкай беражлівасцю. Ну а далей — цюкі жаночых валасоў, горы абгарэлых акуляраў, пенснэ, манокляў, міскі, чайнікі, адзенне, абутак, шчоткі, памазкі, брытвы, чамаданы...


# УП «ГОМЕЛЬОБЛСОЮЗПЕЧАТЬ»

**извещает о проведении 9 февраля 2012 года открытого аукциона**

**по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Ланге, 2а, кабинет 2-7**

| № п/п | Наименование имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ-2705, государственный номер ЕА 8538, год ввода в эксплуатацию 1999 г. | 2 000 000 | 200 000 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ-3307, государственный номер ЕА 8537, год ввода в эксплуатацию 1999 г. | 5 900 000 | 590 000 |

**Продавец:** УП «Гомельоблсоюзпечать», контактный телефон: 74 51 45.

**Имущество расположено по адресу:** ул. Речицкое шоссе, 9а, г. Гомель. Шаг аукциона – 5 %.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (УП «Гомельоблсоюзпечать») Р/с 3012111899012 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гомель, ул. Крестьянская, 29а, БИК 153001369, УНП 400010817 по 3 февраля 2012 года включительно.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Ланге, 2а, каб. 1-2, г. Гомель, 246050 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по 3 февраля 2012 включительно.

К заявлению прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается двумя лотами) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок, определенный в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 51 45 (по осмотру), 74 41 37 (по вопросам участия в аукционе) и на сайте www.gomel-osp.by**


Вольга ДОЎГАЯ:

# «КІРАЎНІК ПАВІНЕН ЦАЛКАМ ДАВЯРАЦЬ СВАЙМУ ПРЭС-САКРАТАРУ»

**НА гэтым тыдні кіраўнікі прэс-службаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання займаліся павышэннем сваёй кваліфікацыі. Курс «Удасканаленне дзейнасці прэс-службаў у сучасных умовах» вывучала і прэс-сакратар прэм'ер-міністра Беларусі Вольга Доўгая. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з ёю пра асаблівасці гэтай прафесіі.**



**— Хто ж такі прэс-сакратар?**

— Пачнём з таго, што для нашай краіны прэс-сакратар — гэта дастаткова новая з'ява. Яна ў прынцыпе новая. Калі з'явілася прэса ў больш-менш сучасным выглядзе, тады з'явіліся і прэс-сакратары. Я тут чалавек новы. На маю думку, прэс-сакратар — гэта, па сутнасці, твар арганізацыі. Гэта калі не рупар, то яе імідж і рэпутацыя. Ён павінен несці не толькі інфармацыю, але і нейкую станоўчую энергетыку. Кажучы прасцей, рабіць так, каб арганізацыю, якую ён прадстаўляе, сродкі масавай інфармацыі проста любілі (*усміхаецца.* — **Аўт.**). Кіраўнік арганізацыі практычна заўсёды не мае часу на тое, каб адфільтраваць і ўвабраць у сябе неабходную інфармацыю. Кіраўнік павінен вельмі моцна давяраць свайму прэс-сакратару, бо бачыць гэтыя патокі інфармацыі, можна сказаць, яго вачамі.

**— Значыць, давер — гэта самае важнае? Прэс-сакратару жа часта даводзіцца і ад асобы кіраўніка казаць...**

— Так, вядома. У ідэале перш за ўсё павінен быць давер. А пасля ўжо: уменне захоўваць сакрэты, эрудыраванасць, асабісты досвед (абавязкова!), каб усё ўзважана і аналітычна ацэньваць. Таксама вельмі важныя — спакой і вытрымка. Бо бываюць вельмі цяжкія стрэсавыя сітуацыі.

**— Што даюць вам гэтыя курсы?**

— Можа быць, гэта і не ідэальны спосаб паляпшэння нашай працы, але людзі прыходзяць і размаўляюць паміж сабой на розных узроўнях. Ёсць эксперты, праводзяцца «круглыя сталы». Можна назіраць спробы дыскусій. Камусьці не хапае чыноўніцкага вопыту, камусьці журналісцкага, камусьці менеджарскага. У нас жа няма нейкай канкрэтнай навучальнай установы, дзе б рыхтавалі менавіта прэс-сакратароў. Калі нам чыталі лекцыі, я сабе запісала вельмі цікавую рэч: «Трэба быць звышмудрым, звышдобрым, мець гонар, годнасць...» Зразумела, што гэта можна аднесці да чалавека любой прафесіі. Але ўсё ж такі гэта ідэал, да якога трэба імкнуцца. Ведаеце, ёсць людзі, якія вельмі шмат працуюць, шмат робяць, але яны не хочуць пра гэта казаць. Часта з-за мінулага дрэннага вопыту кантактаў з прэсай. Але трэба разумець, што калі арганізацыя, яе работнікі вельмі шмат робяць усяго добрага, а ніхто пра гэта не ведае, то ў грамадстве ствараецца вакуум. І пачынаюць казаць: «А чым яны там займаюцца? Што яны робяць? Можа, яны там па калідорах бадзяюцца?». З'яўляюцца чуткі.

**— Я правільна зразумеў: прэс-сакратар не павінен быць перашкодай паміж СМІ і арганізацыяй?**

— Гэта вельмі сумнеўная «паслуга». Вось ён перашкодзіў, а журналіст жа ўсё роўна даб'ецца свайго. Бо яму паставілі задачу, і ён яе ўсё роўна выканае. Лепш пайсці яму насустрач. Тут вельмі тонкая мяжа — павінна быць супрацоўніцтва. Безумоўна, трэба абмяжоўваць доступ да інфармацыі пра асабістае жыццё. Трэба прасіць пачакаць, калі не прынята нейкага канчатковага рашэння. Але ў астатнім патрэбна супрацоўніцтва.

**— А курсы ў першы раз праходзяць?**

— Не. Адбываецца гэта раз на тры гады. Але нават тры гады — гэта вельмі вялікі тэрмін. А кантакты паміж намі (прэс-сакратарамі. — **Аўт.**) павінны быць вельмі мабільнымі. Можа, хоць бы раз на паўгода праводзіць штосьці накшталт майстар-класа. Каб гэта закранала нейкія бягучыя моманты. Бо яшчэ тры гады таму была толькі «аська», пасля з'явіўся «фэйсбук», «твітар», і невядома, што яшчэ з'явіцца праз год. За ўсім гэтым трэба сачыць, быць у курсе. Важна адчуваць настрой грамадства па тым ці іншым пытанні.

**— У вас ёсць журналісцкі вопыт?**

— Так, я дзесяць гадоў прапрацавала на тэлебачанні.

**— Многія прэс-сакратары не маюць журналісцкай адукацыі ці нават вельмі прыблізна ўяўляюць сабе працу журналіста. Як вы лічыце, калі прэс-сакратар прыйшоў з нейкай іншай сферы, ці павінен ён атрымаць хаця б базавыя навыкі журналісцкай працы?**

— Перавучвацца яму дакладна не трэба. Думаю, усё гэта доследным шляхам можна спазнаць. А астатняе можна даатрымаць вось на такіх курсах. Там мы ўсё тлумачым адно аднаму. Тым больш што навучальных устаноў для прэс-сакратароў няма ва ўсім свеце, наколькі я ведаю. У прафесію прыходзяць міжнароднікі, дыпламаты, журналісты — розныя людзі. У гэтым нічога страшнага няма. Галоўнае, каб быў кантакт з кіраўніцтвам. Поспех маюць тыя, хто наладжвае адносіны з кіраўніком напрамую. Таму што рашэнні часам даводзіцца прымаць вельмі хутка — што сказаць прэсе. Гэта яшчэ адна значная рыса прадстаўніка нашай прафесіі.

**— Якія ў нашых прэс-службаў ёсць слабыя месцы?**

— Напэўна, гэта недастатковасць штату. Прэс-сакратар займаецца і сайтам, і арганізацыяй прэс-канферэнцый, і шмат чым іншым. Аднаму яму вельмі цяжка. Думаю, што наступнай прыступкай на шляху ўдасканалення працы з прэсай будзе з'яўленне моцных прэс-службаў замест аднаго прэс-сакратара. Многія арганізацыі ўжо маюць такія (напрыклад, Міністэрства эканомікі, праваахоўныя органы). Яны ўжо адчулі, што добрая прэс-служба спрашчае працу. Прычым не толькі кіраўніку, але і сродкам масавай інфармацыі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ЁСЦЬ КАНТАКТ!

## Наладжваць эфектыўную камунікацыю з журналістамі вучацца на гэтым тыдні прэс-сакратары дзяржаўных устаноў

XXI стагоддзе паставіла работу з прэсай на прафесійную аснову. Так, цяпер ёсць такая прафесія — кантактаваць з масмедыя. Ад іх залежыць тое, пра што даведаецеся вы. Яны фарміруюць інфармацыйныя нагоды і даюць тлумачэнні па актуальных праблемах. І гэта нярэдка робіць іх такімі ж медыйнымі персонамі, як палітыкаў і бізнэсменаў. Прэс-сакратар расійскага прэзідэнта Наталля Цімакова, напрыклад, трапіла нядаўна ў спіс самых уплывовых жанчын сваёй краіны. У Беларусі ўвесь гэты тыдзень праходзіць пад знакам сувязяў з грамадскасцю. На працягу гэтага часу прэс-сакратары дзяржаўных устаноў павышаюць кваліфікацыю. Пра тонкасці працы і крэатыўныя знаходкі — слова ім самім.

### Уладзімір НЕСЦЯРОВІЧ прэс-сакратар Міністэрства спорту і турызму.



**Стаж**: у прэс-службах з 1992 года.

**Роля прэс-сакратара:** пасярэднік паміж ведамствам з аднаго боку і журналістамі ды грамадствам з другога. Часам ведамасныя інтарэсы, якія супадаюць з дзяржаўнымі, уступаюць у супярэчнасць з інтарэсамі прадстаўнікоў масмедыя ў атрыманні інфармацыі.

**Спецыфіка:** журналісты павінны разумець, што калі нейкая інфармацыя не даецца, гэта не суб'ектыўнае жаданне прэс-сакратара — ёсць пэўныя правілы прадастаўлення інфармацыі. У сілавікоў свая спецыфіка (мне гэты блок таксама знаёмы па рабоце ў прэс-цэнтры пагранведамства): ёсць дзяржаўныя, ваенныя сакрэты, інфармацыя, якая не падлягае выдаванню ў дадзены момант. У Міністэрства спорту і турызму не так шмат тэм, якія не хацелася б выстаўляць на ўсеагульны агляд. У цэлым усе міністэрствы і ведамствы апошнім часам імкнуцца працаваць адкрыта.

**Крэда:** галоснасць. Гэта патрабаванне часу. Іначай інфармацыйны вакуум запаўняецца чуткамі і ўзнікае непатрэбны ажыятаж.

**Стаўленне да крытыкі:** ёсць выданні па нашай галіне, скіраванасць якіх часцей за ўсё крытычная, часам па справе. Міністр спорту і турызму Алег Леанідавіч Качан спакойна і вытрымана ставіцца да крытычных выступленняў. Калі крытыка канструктыўная, гэта нават плюс. Яна дазваляе нам выпраўляць памылкі і трымацца ў тонусе. Калі крытыка дзеля крытыкі... Крыўда застаецца, але ніякіх гнеўных прамоў і тупання нагамі з нашага боку няма.

**Журналісцкі вопыт:** дапамагае з разуменнем ставіцца да калег, да таго, у якіх умовах і якія задачы ім даводзіцца выконваць.

**Павышэнне кваліфікацыі:** гэты курс — карысная форма навучання і кантактаў з людзьмі, якія штодня займаюцца інфармацыйным забеспячэннем дзейнасці сваіх міністэрстваў і ведамстваў. У нас цікавыя лекцыі і выкладчыкі. У тэарэтычным плане мы атрымліваем неабходныя веды па псіхалогіі, кіраванні крызіснымі сітуацыямі, стасунках у калектыве. У практычным — наведваем медыя-структуры, якія фарміруюць імідж органаў дзяржаўнага кіравання. Мы абмяркоўваем агульныя тэндэнцыі развіцця інфармацыйнага грамадства, прасоўванне інфармацыі, узаемадзеянне паміж ведамствамі і іх саміх з медыя-структурамі. Вельмі важна, што гэтыя курсы дазваляюць нам, прэс-сакратарам, кантактаваць адно з адным, гутарыць у кулуарах, часам вырашаць праблемы разам з калегамі. Мы атрымліваем дадатковыя звесткі, набіраемся жыццёвага і прафесійнага вопыту. Гэта гутарка на адной мове.

### Юлія БАЛЬШАКОВА, прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам».



**Стаж прэс-сакратара:** крыху больш за год.

**Спецыфіка:** харчовыя тавары заўжды прыцягваюць шмат увагі, аднак апошнім часам — асабліва. Летась быў павышаны попыт па многіх пазіцыях нашай вытворчасці. Да солі, цукру, алкаголю — самая пільная ўвага. Заўжды трэба быць гатовымі даваць адказы нават на тыя пытанні, якія непасрэдна нашага ведамства не датычаць. Напрыклад, калі размова ідзе пра павышэнне цэн. Мы такіх рашэнняў не прымаем, але прадукцыя наша і цэны на яе павышаюцца, таму мы павінны быць у стане даваць тлумачэнні.

**Місія прэс-сакратара:** давесці да прэсы (а праз прэсу — да насельніцтва) дакладную, праўдзівую, аб'ектыўную інфармацыю пра дзейнасць прадпрыемства. Ствараць пазітыўны імідж арганізацыі, быць яе тварам.

**Складанасці ў рабоце:** рознасць задач — прэс-сакратар хоча прадставіць сваю арганізацыю ў найбольш выгадным святле, у журналіста такой задачы няма. Нават калі ён не хоча знайсці «смажаныя» факты, журналісцкая жылка заўжды ў тым, каб знайсці нейкія недапрацоўкі, пакрытыкаваць. Гэта нармальна, я лічу. Адзінае, трэба шукаць узаемаразуменне. Мне дапамагае журналісцкае мінулае: прэс-сакратарам няблага мець уяўленне знутры пра работу прэсы, а журналістам — пра тое, як працуе прэс-служба. Гэта быў бы найлепшы варыянт.

**Кампраміс інтарэсаў:** уласнік не заўжды гатовы выстаўляць на ўсеагульны агляд інфармацыю пра вытворчасць. Кіраўніцтва арганізацыі павінна разумець, што кантакты з прэсай — вельмі важны аспект, у пэўнай ступені рэклама прадпрыемства. Прэс-сакратар павінен пераканаць у гэтым кіраўніка. У той жа час лёгка зразумець спецыялістаў, якія часам незадаволены інфармацыяй, што з'яўляецца ў прэсе. Журналісты імкнуцца перадаваць інфармацыю як мага больш простай мовай. А спецыялісты мысляць сваёй прафесійнай лексікай, і любое адхіленне ад яе змяняе для іх сэнс. Хоць для абывацеля сэнс не змяніўся, наадварот, стаў больш зразумелым. Да гэтага трэба ставіцца з разуменнем, шукаць кампраміс.

**Павышэнне кваліфікацыі:** цікавіць, у першую чаргу, вопыт іншых спецыялістаў у маёй галіне. Мне хочацца даведацца, як астатнія спраўляюцца з цяжкасцямі, што ўзнікаюць на іх шляху, і параўнаць з тым, што раблю ў такіх сітуацыях я. Ад выкладчыкаў, якія вядуць гэты курс, я хачу пачуць пра новыя метады і формы работы ў нашай сферы.

### Сяргей КАБАКОВІЧ, начальнік прэс-службы ўнутраных войск.

**Стаж**: амаль чатыры гады.

**Галоўныя якасці для прэс-сакратара:** цярпімасць і ўпартасць.

**Спецыфіка**: ваенная прэс-служба адрозніваецца ад цывільнай. Калі носіш форму, трэба апроч таго, каб адэкватна мысліць, яшчэ і адэкватна выконваць загад. Гэта ў цывільных можна колькі заўгодна даказваць начальніку, што ён не мае рацыі і трэба зрабіць па-іншаму. У ваенных паняцце субардынацыі вельмі моцнае.



**Складанасці ў рабоце:** складана напачатку — калі фарміруецца журналісцкі пул. Пасля прасцей: ведаеш стыль працы, перавагі. Якая інфармацыя патрэбна газетчыкам, якую «карцінку» ацэняць фота- і тэлежурналісты. З кожным прадстаўніком СМІ трэба працаваць індывідуальна.

**Працоўныя байкі:** мы ўжо заўважылі такую традыцыю — калі запрашаем прэсу на кваліфікацыйныя выпрабаванні на права нашэння крапавага берэта, абавязкова будзе брыдкае надвор'е: холад, дождж, слота. Заўжды жартуем, што вязём журналістаў у сапраўдныя палявыя ўмовы, як і сапраўдных байцоў, — скрозь агонь, ваду і медныя трубы.

**Сакрэт эфектыўнай камунікацыі:** усё залежыць ад таго, як кіраўнік падраздзялення наладжвае сваю работу з журналістамі, як ставіцца да іх. З такім жа водгукам будуць працаваць і журналісты.

**Ала МАЧАЛАВА.**


## Каменский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документов | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Заценье, участок № 2, 623282703101000039 | 0,1767 | 2 072 304 | 3 887 400 | 388 740 |
| 2 | аг. Камено, участок № 2, 623282704101000177 | 0,2244 | 2 072 304 | 6 732 000 | 673 200 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619071109, ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска, УНП 600181630, ОКПО 04431547600, код платежа 4901 Каменский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **23 февраля 2012 года в 11.00** по адресу: Минская обл., Логойский р-н, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 11.00 20 февраля 2012 года.

Контактные телефоны: 8 (01774) 72 3 35, 72 3 81, 72 3 43, (+37529) 170 02 61.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.


### У сталіцы замёрз чалавек

**Каля аднаго з дамоў на праспекце Пераможцаў у Мінску знайшлі амаль непрытомнага мужчыну, які праз 45 хвілін пасля гэтага памёр у машыне хуткай дапамогі.**

Папярэдняя прычына смерці — пераахаладжэнне. Як расказаў старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашаў, на невядомага чалавека, які спакойна ляжаў на вуліцы ў мароз, звярнулі ўвагу мінакі. Яны і патэлефанавалі ў «хуткую». Мужчыне прыкладна 35-40 гадоў. Калі меркаваць па выглядзе, гэта асоба без пастаяннага месца жыхарства.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### Наматала на карданны вал...

**Няшчасны выпадак з гібеллю чалавека адбыўся апоўдні на тэрыторыі сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мясапрадукт» у вёсцы Скамарошкі Стаўбцоўскага раёна.**

Прыбыўшыя на месца здарэння супрацоўнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях ўбачылі наматаныя на карданны вал трактара «МТЗ-80» з бочкай часткі цела чалавека...

— У выніку няшчаснага выпадку загінуў мужчына, індывідуальны прадпрымальнік, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Ён на асабістым трактары на падставе дагавора аказання паслуг, заключаным паміж ІП і СТАА «Мясапрадукт», адкачваў сцёкавыя воды з каналізацыйнага калодзежа. Па словах нашых выратавальнікаў, што былі на месцы, сведкаў здарэння няма. Зараз прычына і абставіны няшчаснага выпадку ўстанаўліваюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Гвалтоўная смерць ці нешчаслівы выпадак?

**Калі па выкліку ў 4 гадзіны раніцы на пажар жылога дома ў вёсцы Сяргеевічы Пухавіцкага раёна прыбылі падраздзяленні МНС, цаглянае жыллё ўжо гарэла адкрытым полымем, дах абрынуўся ўнутр. У гэтым жылым памяшканні пражываў 36-гадовы кватэраздымшчык, аднак напачатку не было зразумела, ці ў доме ён.**

— Пры разборы канструкцый цела знайшлі не адразу: яно знаходзілася ў самым далёкім кутку пакоя. Прычым з прыкметамі гвалтоўнай смерці: вакол шыі загінулага быў абматаны мяккі дрот або шнур, — расказала «Звяздзе» старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк. — Паводле слоў суседзяў, мужчына часова нідзе не працаваў, на жыццё зарабляў рыбалкай, прадаючы «трафеі» суседзям і знаёмым. Прычым усім хваліўся, што яго штодзённы заробак складае каля 300 тысяч рублёў. Жыў ён адзін, алкаголем асабліва не злоўжываў.

Увечары, паводле слоў суседа, мужчына збіраўся на начную рыбалку. Той жа самы сусед, пачуўшы трэск шыферу, і паведаміў у службу выратавання пра пажар.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## Уважаемые акционеры ОАО «ТОРГОВЫЙ ДОМ «РЕЧИЦКИЙ»!

**Покупатель:** Открытое акционерное общество ОАО «Торговый Дом «Речицкий» г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 61, приобретает на внебиржевом рынке акции собственного выпуска на баланс Общества для последующего уменьшения уставного фонда путем сокращения их общего количества (аннулирования).

**Брокер Покупателя акций, место заключения договоров купли-продажи:** закрытое акционерное общество «Инвестиционная компания «БелАСКО-Инвест», 246050, г. Гомель, ул. Советская, 32-а, тел.: 77 61 42, 77 02 28.

**Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель:** 89 090 штук простых (обыкновенных) акций.

**Цена приобретения акций:** 8990 (восемь тысяч девятьсот девяносто) рублей за одну акцию.

**Сроки, форма и порядок оплаты акций:** оплата осуществляется с 27.02.2012 года, но не позднее 15 календарных дней со дня поступления акций на счет «депо» Общества, денежными средствами в белорусских рублях через кассу региональной дирекции № 600 ЗАО Банк (ВТБ) Беларусь, г. Гомель, ул. Советская, 32а.

**Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи):** 27 февраля 2012 года.

**Дата окончания покупки акций:** 26.04.2012 год.

**Предложения акционеров о продаже акций принимаются с 26.01.2012 года по 24.02.2012 года по адресу: г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 61, тел.: 45 53 62, 46 42 71.**

УНП 400054000

*Наблюдательный совет «ОАО «ТД «Речицкий», дирекция.*

# ГОМЕЛЬ ПЕРАДАЎ ЭСТАФЕТУ КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦЫ НЯСВІЖУ

## Але пажадаў застацца неафіцыйнай культурнай сталіцай Беларусі назаўсёды

**На прэс-канферэнцыі, прысвечанай прэзентацыі культурнай сталіцы Беларусі і СНД 2011 года ў Мінску, жарт дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь падхапілі гомельскія журналісты і прадстаўнікі гарадскіх улад. І тым не менш перадача эстафеты адбылася. Ужо трэці год запар у Беларусі будзе дзве сталіцы — акрамя адміністрацыйнай, яшчэ і культурная.**



Галіна Нячаева распавядае пра ўнікальныя экспанаты Веткаўскага музея.



Евангелле-тэтр. 1601 — 1606.

— Горад Гомель упісаў сябе ў гісторыю беларускай культуры, — сказаў на ўрачыстай цырымоніі прэзентацыі культурнай сталіцы Беларусі і СНД 2011 года ў Мінску **міністр культуры Павел ЛАТУШКА**. — Гомель з'яўляецца адным з лідараў у падтрымцы і развіцці айчыннай культуры. Дзякуючы такім праектам, як «Культурная сталіца Беларусі» і «Культурная сталіца СНД», у беларусаў з'яўляецца магчымасць бліжэй пазнаёміцца з высокім узроўнем прафесійнага і аматарскага мастацтва. Хацелася б, каб усе гарады, якія атрымалі ў розны час статус культурнай сталіцы, назаўсёды заставаліся такімі.

Праект «Культурная сталіца Беларусі» дазваляе больш актыўна і шырока прадставіць культурную самабытнасць нашых гарадоў і рэгіёнаў, праз культурныя мерапрыемствы стварыць умовы сацыяльна-эканамічнага развіцця, павысіць турыстычную прывабнасць краіны, прыцягнуць спонсарскія і прыватныя сродкі на рэалізацыю грамадска-культурных ініцыятыў і актывізаваць грамадскасць. Напрыклад, падчас рэалізацыі праекта ў Полацку колькасць турыстаў у гэтым горадзе ўзрасла ў паўтара раза, а на працягу года прайшло каля 60 культурных мерапрыемстваў. У Гомелі за мінулы год адбылося больш за 220 культурных падзей.

— Ганаровае званне «культурнай сталіцы» дапамагло аб'яднаць многіх людзей ідэяй захавання і развіцця нацыянальнай культуры, дало імпульс для рэалізацыі новых арыгінальных праектаў і ідэй, — сказаў **старшыня Гомельскага гарвыканкама Віктар ПІЛІПЕЦ.**

Летась у Гомелі былі адкрыты Мастацкая галерэя імя Гаўрылы Вашчанкі, Гарадскі цэнтр культуры на 560 месцаў, рэканструяваны Дом культуры чыгуначнікаў. Гэта дазволіла гораду над Сожам правесці шматлікія выстаўкі самага высокага ўзроўню і запрасіць на свае пляцоўкі лепшыя беларускія і замежныя калектывы. Падчас праекта Гомель прыняў гасцей з Францыі, Венесуэлы, Расіі, Украіны, Малдовы, Узбекістана, Казахстана, Грузіі... Усяго тут адбылося 12 фестываляў-конкурсаў, сярод якіх 9 — міжнародных (самыя буйныя — «Рэнесанс гітары», «Славянскія тэатральныя сустрэчы», «Сожскі карагод» і «Залатая рысь»). У культурнай сталіцы Беларусі і СНД 2011 года прайшло 27 канцэртаў, шмат пленэраў і выставак, толькі ў палацава-паркавым ансамблі былі рэалізаваны 24 праекты.

— Статус культурнай сталіцы дазволіў і Гомелю шмат дзе пабываць і паказаць сябе, — дадала **намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама Алена КЛІЧКОЎСКАЯ.** — Мы прадставілі свае дасягненні ў Польшчы, Чэхіі, Казахстане, Расіі, Украіне... У выніку гэтых сустрэч узніклі новыя кантакты, мы адчулі цікавасць да горада не толькі як да культурнага, але і як да гістарычнага цэнтра.

Летась на конкурснай аснове чарговым горадам, які атрымаў права называцца культурнай сталіцай, быў вызначаны Нясвіж. У конкурсе бралі ўдзел Маладзечна, Ліда, Бабруйск...

— Конкурсная сітуацыя была досыць складанай, і тым не менш, улічваючы значнасць Нясвіжа як аднаго са старэйшых культурных цэнтраў Еўропы, было прынята рашэнне прызнаць культурнай сталіцай 2012 года менавіта гэты горад, — падзяліўся з журналістамі **намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ.** — Патэнцыйныя магчымасці Гомеля як абласнога цэнтра і горада з даволі развітой інфраструктурай і вялікай колькасцю аб'ектаў культурнай спадчыны, безумоўна, непараўнальна большыя, чым у Нясвіжа, але ў дадзеным выпадку размова не ідзе пра спаборніцтва. Галоўнае, каб кожны горад максімальна выкарыстаў свае магчымасці і раскрыўся беларусам і свету, а сам праект штогод узбагачаўся новымі формамі і зместам. Гэта будзе ўзбагачаць і краіну ў цэлым.

У рамках прэзентацыі культурнай сталіцы Беларусі і СНД 2011 года ў Мінску ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася выстаўка **«Шэдэўры кніжнага мастацтва XVI — пачатку XX стагоддзя»,** на якой прадстаўлены кніжныя помнікі з фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і Веткаўскага музея народнай творчасці імя Шклярава.

— Кожны экспанат выстаўкі — безумоўная гісторыка-культурная каштоўнасць, — правяла кароткую і яскравую экскурсію ў дзень адкрыцця экспазіцыі **дырэктар Веткаўскага музея Галіна НЯЧАЕВА**. — Магчымасць пазнаёміцца з сапраўднымі воінамі Слова, якія прыйшлі да нас з глыбіні стагоддзяў, — надзвычай рэдкая. Некаторым з крохкіх папяровых помнікаў — каля паўтысячы гадоў! Няшмат каменных збудаванняў здольна перажыць такі час...

Самы старажытны манускрыпт, які прадстаўлены на выставе, — рукапіснае Евангелле-тэтр (Чатырохевангелле) першай паловы XVI стагоддзя. Музей набыў яго ўсяго толькі пяць гадоў таму, а да гэтага 17 пакаленняў беларусаў захоўвалі святыню і выратоўвалі яе ад знішчэння падчас царкоўных ганенняў.

Самая ранняя друкаваная кніга, якую можна ўбачыць на выставе, датуецца 1560 годам. Гэта «Вучыцельнае Евагелле», якое было надрукавана ў Заблудаве Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам. Тут можна палюбавацца і на кнігі першых усходнеславянскіх друкароў Васіля Гарабурды, Анісіма Радзішэўскага, Міхаіла Слёзкі, на выданні Віленскай, Супрасльскай, Гродзенскай, Магілёўскай друкарняў. Экспазіцыя дазваляе пазнаёміцца з майстэрствам стварэння кнігі, з веткаўскім стылем мастацкага дэкору, з адным з самых старажытных спосабаў запісу музыкі — «крукавай натацыяй»...

Выстава будзе працаваць да 5 лютага 2012 года.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота аўтара.**

Да ведама

# У ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ

**Сёлета гродзенцы змогуць глядзець тэлебачанне ў лічбавым фармаце. А ў поўным аб'ёме рэспубліканская Дзяржаўная праграма ўкаранення лічбавага тэлевізійнага і радыёвяшчання будзе рэалізавана ў горадзе над Нёманам да 2015 года, паведамляе інтэрнэт-сайт Гродзенскага гарвыканкама.**

Карыстацца перавагамі новых тэхналогій можна будзе пасля пакупкі ў гандлёвых аб'ектах і ўстаноўкі ў кватэры лічбавай прыстаўкі альбо антэны для стацыянарнага прыёму сігналаў. У Гродне ўжо створана адзіная тэлевізійная інфармацыйная сетка (больш за 110 тысяч кватэр), якая дазволіць гараджанам не проста прымаць тэлесігнал у лічбавым вяшчанні, але і забяспечыць выхад у інтэрнэт.

Як вядома, з 2013 года на тэрыторыі Беларусі спыніцца продаж тэлевізійных прыёмнікаў, у якіх няма ўбудаванага цюнера для прыёму лічбавага сігналу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# КОЛЬКІ ПАКОЯЎ У ПАЛАЦЫ РАДЗІВІЛАЎ?

## Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў Нясвіжы і адчула, чым прываблівае сёлетняя культурная сталіца краіны

Калі ехала ў Нясвіж, у аўтобусе пазнаёмілася з дзяўчынай, студэнткай чацвёртага курса Беларускага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. На пытанне, дзе б хацела працаваць пасля заканчэння навучальнай установы, яна адказала — на сваёй малой радзіме. У нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж».

— А ведаеце, дарэчы, колькі пакояў было ў замку Радзівілаў? — нечакана спытала спадарожніца. І сама ж адказала на пытанне: — Трыста шэсцьдзясят пяць, як дзён у годзе. Таму князі Радзівілы мянялі месца пражывання амаль што кожныя суткі.

— Сапраўды так? — пацікавілася я пазней у загадчыка сектара музея-запаведніка Аляксея Будніка.

— Гэта фантазіі маіх землякоў, — засмяяўся ён. — Зразумела, што жыхары Нясвіжчыны, як сапраўдныя патрыёты свайго краю, хочуць падкрэсліць веліч палаца, заможнасць яго гаспадароў. Колькі на самой справе было пакояў у збудаванні, цяжка сказаць. Спецыялісты называюць розныя лічбы, хтосьці — 180, а нехта і больш.

Аляксей Міхайлавіч запрашае мяне ў інфармацыйную залу, з якой менавіта і пачынаюцца экскурсіі па замку. Пра багатую гісторыю сям'і Радзівілаў і іх радавога гнязда, гісторыю горада, яго помнікаў культуры, архітэктуры. Менавіта тут госці чэрпаюць першапачатковыя звесткі з дапамогай гідаў, а таксама аудыя- і відэатэхнікі.

Пераходзім з экскурсаводам ў другую залу — гісторыі Нясвіжскага замка і будаўніцтва.

— У канцы XVI стагоддзя на месцы драўлянай пабудовы з'явілася каменная. На яе ўзвядзенне выдаткоўваў сродкі князь Міхаіл Радзівіл па мянушцы Сіротка. Разам з замкам мяняўся і сам населены пункт, дзе ўзнікалі вельмі цікавыя муραванкі: ратуша, касцёл, кляштары ды іншыя. Можна з упэўненасцю казаць, што менавіта тады Нясвіж ператварыўся з невялікага мястэчка ў сучасны еўрапейскі горад, які атрымаў магдэбурскае права ў 1586 годзе. Дарэчы, тагачасныя жыхары любілі жартаваць, маўляў, у Нясвіжы — як у Парыжы. Але ў Нясвіжы дамы ніжэйшыя ды гразь жыжэйшая. Выдумка гэта ці не, сёння цяжка сказаць.

— На гэтай гравюры Тамаша Макоўскага паказаны ўжо новыя, каменныя Нясвіж і замак, — расказвае Аляксей Міхайлавіч. — А вось тут, у цэнтры залы, размешчаны нядаўна зроблены макет палаца. У XVI стагоддзі будыніна займала пяць з паловай гектараў, па розных звестках, у ёй месцілася больш за 110 пакояў і каля 12 вялікіх залаў.

У зале архіва і бібліятэкі прыцягвае ўвагу карта з пералікам краін, дзе знаходзяцца архівы нясвіжскіх Радзівілаў: Расія, Украіна, Літва, Польшча, Германія, Фінляндыя. Тым не менш работнікі музея сцвярджаюць, што спіс дзяржаў, якія валодаюць каштоўнымі набыткамі, можна прадоўжыць.

Дарэчы, у гэтай зале ў савецкія часы дэманстраваліся кінафільмы. Падлога тут была драўлянай. Але пры рэстаўрацыі высветлілася, што пад насцілам захавалася арыгінальная плітка XIX стагоддзя.

— Ці шмат у палацы пабытавых рэчаў, звязаных з жыццём вяльможных гаспадароў?

У адказ Аляксей Міхайлавіч запрашае ў выставачную залу. У спецыяльна прыстасаваных для экспанатаў новенькіх вітрынах звяртаюць на сябе ўвагу фрагменты славутых слуцкіх паясоў XVIII стагоддзя, а таксама рэшткі зброі і баявых даспехаў XVI, якія былі знойдзены пад падлогай аднаго з памяшканняў. Беларускія рэстаўратары шмат папрацавалі над экспанатамі, каб прывесці іх у належны выгляд. І зараз яны быццам новенькія, толькі што знятыя з вершніка. Такім рэдкім экзэмплярам пазайздросціць любы музей.

У выніку пуску першай чаргі палацавага комплексу адчынена пяць невялікіх залаў. Усяго ж плануецца афарміць трыццаць. Але гэта ў перспектыве. А пакуль у канцы снежня — пачатку студзеня адчынілі дзверы для наведнікаў чатыры новыя залы.

У белай, афармленай у прывабных светлых тонах, магнаты калісьці ладзілі невялікія балі. Рэстаўратары захавалі тут статычны інтэр'ер, часткова — арыгінальныя драўляныя панэлі і ляпніну на столі. Каб наведнікі маглі прасякнуцца тагачаснай атмасферай, музей набыў мэблю XIX стагоддзя, аздобіў сцены жывапіснымі палотнамі, якія захоўваліся ў нацыянальных гістарычным і мастацкім музеях. Як зазначыў Аляксей Буднік, у палацы Радзівілаў налічвалася 984 карціны. Таму ў задумах кіраўніцтва і супрацоўнікаў — упрыгожыць памяшканне копіямі арыгіналаў, якія знаходзяцца за мяжой.

У малой сталоўцы, дзе Радзівілы харчаваліся, адразу кідаецца ў вочы вялікі стол, а побач — меншых памераў, дзе сядзела прыслуга і сачыла за тым, каб своечасова паднесці гаспадарам ежу. За дзвярыма — невялікае памяшканне (крэданс) для сервіроўкі страў. Меню было разнастайным. Напрыклад, у XVIII-XIX стагоддзях ужывалі такія цікавыя пачастункі, як губы лася, ныркі мядзведзя.

У камiннай зале захавалася шмат даўніны: сам камін, печы, драўляныя бэлькі на столі. Але больш за ўсё мяне зацікавілі «крульныя» крэслы.

— Такія ўпершыню з'явіліся ў старажытным Рыме спецыяльна для членаў сената, — растлумачыў Буднік. — Але сядзець у іх было вельмі нязручна.

Па розных звестках, у аднаўленай гетманскай зале на працягу XVIII стагоддзя месціліся партрэты гетманаў з роду Вішнявецкіх і Радзівілаў, якія былі сваякамі. Пасля расійска-шведскай вайны замак быў зруйнаваны, і аднаўляў яго Міхал Казімір Радзівіл V са сваёй жонкай Францішкай Уршуляй (у дзявоцтве Вішнявецкай). Таму рэстаўратары змясцілі тут два гербы вяльможных сем'яў, каб паказаць іх сувязь, узаемадапамогу адно аднаму ў нялёгкія часіны.

Пакуль тут выявы толькі чатырох прадстаўнікоў. Шчыра скажу, пакой уражвае сваімі памерамі, шыкоўнасцю, убранствам. Але, як запэўніў мой субяседнік, ён стане яшчэ лепшым, калі тут з'явяцца копіі арыгіналаў усіх партрэтаў гетманаў з боку абодвух магнацкіх родаў. Для гэтага ўжо падрыхтавана месца. Акрамя таго, у гетманскай плануецца ладзіць брыфінгі, канферэнцыі, пасяджэнні знакамітых асоб, якія будуць наведваць музей, для чаго тут устаноўлены стылізаваныя крэслы на 100 чалавек.

У перспектыве супрацоўнікі музея плануюць арганізаваць яшчэ некалькі экскурсійных маршрутаў па залах. А калі дазволяць адпаведныя службы, то і па пераходах, валах замка, аднаўленых бастыёнах, з тым, каб расказаць наведвальнікам аб гераічных падзеях, аблогах, што вытрымаў замак у XVII стагоддзі. Распрацоўваюцца маршруты па мясцінах горада і раёна, звязаных з жыццём Радзівілаў. Яны запрацуюць, калі ў музея з'явіцца больш фінансавых магчымасцяў.

— Але гэта пакуль у планах. Цяпер жа клапоцімся пра тое, як найлепш уладкаваць палац, стварыць адпаведную інфраструктуру і ўмовы для турыстаў, удасканаліць паслугі, — заўважыў Буднік. — На мой погляд, гэта справа не толькі музея, але і індывідуальных прадпрымальнікаў, гандлю, усіх зацікаўленых службаў раёна.

Сёння білет для наведвання палацавага ансамбля і парку каштуе для дарослых 20 тысяч рублёў, для дзяцей і студэнтаў — 10. Для параўнання: у краінах Заходняй Еўропы 10 еўра і болей. Музейшчыкі закупілі 35 аўдыягідаў, плэеры для абслугоўвання турыстычных груп.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Минский городской центр недвижимости

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 27 февраля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод»**

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)

| | Инв. № кадастровый | Инв. № бух. |
|---|---|---|
| Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) общей площадью 294,2 кв.м | 600/С-93934 | 39271 |
| Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (овощехранилище) общей площадью 115,4 кв. м | 600/С-121926 | 39272 |
| Площадка асфальтобетонная 1022 кв.м | | 45651 |
| Бордюры (0,16; 0,08) (0,16–677 м.п.; 0,08–24 м.п.) | | 45651/1 |
| Внутренние дороги и дорожки (внутр. – 1242 кв.м; пеш. – 186 кв.м) | | 45651/2 |
| Пешеходная дорожка (б) | | 45651/3 |
| Пешеходная дорожка (к) | | 45651/4 |
| Здание специализированное иного назначения (общежитие) общей площадью 590,8 кв.м | 600/С-93935 | 39270 |
| Кондиционер TRM-12H | | 42235 |
| Кондиционер TRM-12H | | 42236 |
| Теплосчетчик | | 42254 |
| Теплосчетчик | | 42255 |
| Теплица (сооружение специализированное сельскохозяйственного назначения общей площадью 5 462,9 кв.м) | 600/С-121928 | 25053 |
| Внутренние дороги и пешеходные дорожки | | 45650 |
| Бордюр 0,16 | | 45650/1 |
| Пешеходная дорожка грунтовая | | 45650/2 |
| Высоковольтная линия электроснабжения 87/74 | | 17274 |
| Котел 2-барабанный водотрубный ДКВР2,5-13 | | 19006 |
| Котел 2-барабанный водотрубный ДКВР2,5-13 | | 19007 |
| Внеплощадочная телефонизация 50/70-36 | | 20952 |
| Котел паровой МЗК | | 22346 |
| Солерастворитель | | 25185 |
| Наружное освещение (кабель ААШВ-125 м; светильник ЖКУ 51-150-013 – 6 шт.; лампа ДРЛ – 6 шт.) | | 39294 |
| Автоматическая канализационная станция | 600/С-120317 | 39295 |
| Подогреватель пароводяной ПП2-17-7-2 | | 42910 |
| Газораспределительный пункт (здание специализированное энергетики общей площадью 12,5 кв.м) | 600/С-120320 | 45178 |
| Наружные сети хоз. питьевого водопровода (трубопровод чугунный д. 150 мм – 440 м.п.; д.100 мм – 235 м.п.; д. 50 мм – 55 м.п.; задвижки д. 150 – 10 шт.; д. 100 – 3 шт.; д. 50 – 2 шт.; колодец железобетон. д. 1000 – 18 шт.; пожарный гидрант д. 1000 – 3 шт.) | | 45308 |
| Наружные сети канализации 260 м.п. | | 45309 |
| Тепловые сети | | 45310 |
| Наружные сети электроснабжения 0,4кВ (кабель АВВГ 2(3х50+1х25)=76 м; кабель АВВГ (3х10+1х4)=94 м; кабель АВВГ(3х16+1х10)=500 м; кабель ААБ 3х120=412 м; кабель АБ (3х10)=20 м; кабель2(3х25)=152 м | | 45311 |
| Газопровод низкого давления | | 45312 |
| Трансформаторная подстанция ТП № 1344 | | 45313 |
| Насосная | 600/С-120318 | 45358 |
| Ограждение охранной зоны артскважины | | 45359 |
| Отстойник (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 600/С-120319 | 45361 |
| Подземные резервуары (2 шт.) | 600/С-120318 | 45387 |
| Артезианская скважина | 600/С-120318 | 45486 |
| Котельная (здание котельной общей площадью 662,3 кв.м) | 600/С-120322 | 45654 |
| Трансформаторная подстанция (здание специализированное энергетики общей площадью 63,3 кв.м) | 600/С-120321 | 45655 |
| Газоанализатор ФСТ 03М | | 46269 |
| Пожарные гидранты водопровода (гидрант – 5 шт.; колодец железобетонный – 5 шт.) | | 45308/1 |
| Зеленые насаждения | | 45354 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельных участках** | Кадастровый номер 623681700001000160, площадь – 1,6891 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений профилактория; кадастровый номер 623600000001000217, площадь – 1,2 га, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий овощехранилища и теплицы на фактически занятых под объекты землях |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Ждановичский с/с, район д. Подгорье |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минский моторный завод», ул. Ваупшасова, 4, 220070, г. Минск |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов** | 2 442 664 268 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 100 000 000 белорусских рублей |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **27 февраля 2012 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 27.01.2012 по 23.02.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости»),**
**(017) 230 22 07 (ОАО «Минский моторный завод»).**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
❖ Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА САНТЭП**

| № лота | Наименование объекта |
|---|---|
| 1 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421829 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 2 | Холодильник «Апшерон», инв. № 421044 – **171 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 3 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421798 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 4 | Холодильник «Саратов», инв. № 421809 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 5 | Холодильник «Снежинка», инв. № 7891 – **276 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 6 | Холодильник «Морозко-3М», инв. № 7892 – **128 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 7 | Холодильник «Саратов», инв. № 421985 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 8 | Холодильник «Саратов», инв. № 500364 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 9 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500368 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 10 | Холодильник «Саратов», инв. № 500110 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 11 | Холодильник «Саратов», инв. № 500120 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 12 | Холодильник «Саратов», инв. № 500115 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 13 | Холодильник «Саратов», инв. № 500119 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 14 | Холодильник «Саратов», инв. № 500118 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 15 | Холодильник «Арагац», инв. № 500121 – **107 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 16 | Холодильник «Саратов», инв. № 500116 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 17 | Холодильник «Саратов», инв. № 500117 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 18 | Холодильник «Саратов», инв. № 500108 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 19 | Холодильник «Саратов», инв. № 500113 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 20 | Холодильник «Саратов», инв. № 500114 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 21 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500367 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 22 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500365 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 23 | Стол однотумбовый, инв. №7809 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 24 | Стол двухтумбовый, инв. № 7816 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 25 | Стол однотумбовый, инв. № 7607 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 26 | Стол письменный, инв. № 7815 – **69 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 27 | Стол двухтумбовый, инв. № 7851 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 28 | Шкаф книжный, инв. № 7822 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 29 | Шкаф книжный, инв. № 7831 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 30 | Шкаф книжный, инв. № 7848 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 31 | Шкаф книжный, инв. № 7849 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 32 | Шкаф для одежды, инв. № 7846 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 33 | Шкаф для одежды, инв. № 7845 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 34 | Шкаф для одежды, инв. № 7829 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 35 | Шкаф для одежды, инв. № 7847 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 36 | Шкаф книжный, инв. № 7826 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 37 | Шкаф книжный, инв. № 7841 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 38 | Стол однотумбовый, инв. № 7833 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 39 | Стол двухтумбовый, инв. № 7823 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 40 | Стол однотумбовый, инв. № 7824 – **59 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 41 | Шкаф книжный, инв. № 7810 – **336 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 42 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 7870 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 43 | Стол двухтумбовый, инв. № 500306 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 44 | Шкаф книжный, инв. № 500307 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 45 | Шкаф одежный, инв. № 500308 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 46 | Стол письменный, инв. № 500309 – **69 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 47 | Стол двухтумбовый, инв. № 500310 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 48 | Стол двухтумбовый, инв. № 500311 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 49 | Стол двухтумбовый, инв. № 500312 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 50 | Стол двухтумбовый, инв. № 500313 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 51 | Стол двухтумбовый, инв. № 500315 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 52 | Стол двухтумбовый, инв. № 500316 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 53 | Шкаф книжный, инв. № 500323 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 54 | Шкаф одежный, инв. № 500324 – **159 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 55 | Шкаф книжный, инв. № 500325 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 56 | Шкаф книжный, инв. № 500326 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 57 | Стол двухтумбовый, инв. № 500327 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 58 | Стол двухтумбовый, инв. № 500328 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 59 | Стол двухтумбовый, инв. № 500329 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 60 | Стол двухтумбовый, инв. № 500332 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 61 | Стол двухтумбовый, инв. № 500333 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 62 | Стол двухтумбовый, инв. № 500334 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 63 | Стол двухтумбовый, инв, № 500335 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 64 | Стол двухтумбовый, инв. № 500336 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 65 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 500337 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 66 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 500338 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 67 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7862 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 68 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7863 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 69 | Шкаф трехстворчатый с антресолью, инв. № 7864 – **368 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 70 | Шкаф .трехстворчатый с антресолью, инв. № 7865 – **368 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 71 | Стол под компьютер, инв. № 7882 – **155 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 72 | Стол под компьютер, инв. № 7883 – **103 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 73 | Стол под компьютер, инв. № 7884 – **155 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 74 | Стол под компьютер, инв. № 7885 – **103 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 75 | Шкаф одежный, инв. № 7890 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 76 | Стол двухтумбовый, инв. № 7893 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 77 | Стол двухтумбовый, инв. № 7894 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 78 | Шкаф для одежды, инв. № 7897 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 79 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7909 – **133 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 80 | Мягкая мебель «Рось», инв. № 7905 – **500 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 81 | Телевизор «Горизонт 655-4», инв. № 7895 – **452 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 82 | Телевизор «Г 54 ТЦ 418», инв. № 7887 – **388 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 83 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421826 – **202 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 84 | Выставочная конструкция, инв. № 422051 – **22 902 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 85 | Стол офисный красный, инв. № 422077 – **2 115 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 86 | Факс «Panasonic KX-FT 908», инв. № 421940 – **1 134 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 87 | Радиотелефон «Panasonic KX-A 143», инв. № 421995 – **195 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 88 | Телефакс «Panasonic KX-FT 22», инв. № 422056 – **843 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 89 | ПО. Телефакс «Panasonic KX-FT 64», инв. № 422057 – **1 022 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 90 | Телефакс BROTHER FAX 236», инв. № 422058 – **825 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 91 | Факс «Samsung sf-2S00», инв. № 44295 – **375 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 92 | Ксерокс – многофункциональное устройство «SHARP AR-5316», инв. № 44345 – **1 800 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 93 | Палатка торговая, инв. № 7931 – **2 164 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 94 | Набор мебели «Ямполь», инв. № 7925 – **5 925 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 95 | Набор мебели «Дублин», инв. № 7928 – **533 000** белорусских рублей (без учета НДС); |
| 96 | Ковер 2,5х5,45, инв. № 7927 – **116 000** белорусских рублей (без учета НДС). |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 13 февраля 2012 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **14 февраля 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, задаток – 5%. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс).**

БПС-СБЕРБАНК

## ОАО «БПС-СБЕРБАНК» ИНФОРМИРУЕТ:

**С 26.01.2012** прекращается прием денежных средств на условиях срочных банковских депозитов физических лиц в белорусских рублях: **«Перспективный», «Баланс интересов», в иностранной валюте – «Настоящий выбор», «Динамичный».**

**С 02.02.2012** устанавливается следующий размер процентов по вновь привлекаемым депозитам физических лиц в иностранной валюте:

**«Сохраняй»**

| Сумма вклада/диапазон срока | 90–189 дней | 190–369 дней | 370–500 дней |
|---|---|---|---|
| от 100 – до 1 000 USD/EUR, от 3 000 – до 30 000 RUB | 7,4 | 7,7 | 7,9 |
| от 1000 – до 5 000 USD/EUR, от 30 000 – до 150 000 RUB | 7,6 | 7,9 | 8,1 |
| от 5 000 – до 20 000 USD/EUR, от 150 000 – до 600 000 RUB | 7,9 | 8,2 | 8,4 |
| от 20 000 USD/EUR, от 600 000 RUB | 8,3 | 8,6 | 8,8 |

**«Пополняй»**

| Сумма вклада/диапазон срока | 90–189 дней | 190–369 дней | 370–500 дней |
|---|---|---|---|
| от 100 – до 1 000 USD/EUR, от 3 000 – до 30 000 RUB | 7,3 | 7,6 | 7,8 |
| от 1000 – до 5 000 USD/EUR, от 30 000 – до 150 000 RUB | 7,5 | 7,8 | 8,0 |
| от 5 000 – до 10 000 USD/EUR, от 150 000 – до 300 000 RUB | 7,7 | 8,0 | 8,2 |
| от 10 000 – до 20 000 USD/EUR, от 300 000 – до 600 000 RUB | 7,9 | 8,2 | 8,4 |
| от 20 000 – до 50 000 USD/EUR, от 600 000 – до 1 500 000 RUB | 8,1 | 8,4 | 8,6 |
| от 50 000 USD/EUR, от 1 500 000 RUB | 8,3 | 8,6 | 8,8 |

**«Управляй»**

| Неснижаемый остаток/диапазон срока | 90–189 дней | 190–369 дней | 370–500 дней |
|---|---|---|---|
| 500 USD/EUR, 15 000 RUB | 6,7 | 7,0 | 7,4 |
| 1 000 USD/EUR, 30 000 RUB | 6,9 | 7,2 | 7,6 |
| 5 000 USD/EUR, 150 000 RUB | 7,2 | 7,5 | 7,8 |
| 20 000 USD/EUR, 600 000 RUB | 7,6 | 7,9 | 8,1 |

К срочным банковским депозитам физических лиц в иностранной валюте **«Сохраняй», «Пополняй», «Управляй»**, привлеченным **до 02.02.2012**, устанавливаемый размер процентов будет применен **с 02.03.2012.**

**С 02.02.2012** по договорам срочных банковских депозитов в иностранной валюте устанавливается следующий размер процентов:

| Наименование депозита | Срок привлечения | Размер процентов (годовых): доллары США, евро | Размер процентов (годовых): российские рубли |
|---|---|---|---|
| **Баланс интересов** | 1 год | за 1-й мес. – 6,5; за 2-10 мес.– 7,25; за 11-12 мес.– 7,5 | - |
| **карт-счет Универсальный** | 1 год | 7,3 | - |
| **Настоящий выбор** | 370 дней | до 5 тыс. – 7,0; от 5 тыс. – до 10 тыс. – 7,2; от 10 тыс. – 7,4 | до 150 тыс. – 7,0; от 150 тыс. – до 300 тыс. – 7,2; от 300 тыс. – 7,4 |
| **Динамичный** | 3 года | 7,5 | 7,5 |

Устанавливаемый размер процентов будет применен **с 02.02.2012:**

- к переоформляемым **с 02.02.2012** договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте **«Динамичный»;**
- к вновь заключаемым и автоматически продлеваемым **с 02.02.2012** договорам карт-счета в иностранной валюте **«Универсальный».**

Устанавливаемый размер процентов будет применен **с 02.03.2012:**

- к заключенным **до 15.12.2011** договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте **«Баланс интересов»;**
- к заключенным **до 26.01.2012** договорам срочных банковских депозитов в иностранной валюте **«Динамичный», «Настоящий выбор»;**
- к переоформленным **до 02.02.2012** договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте **«Динамичный».**

**Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по телефонам:**

- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148**, **2-148-148**; Velcom **(044) 77-00-148**, **77-55-148**.

Проценты, выплаченные по депозитам в иностранной валюте в течение 2011 г. (млрд. руб.): январь – 10,3; февраль - 10,0; март – 11,5; апрель – 10,0; май – 15,6; июнь – 15,8; июль – 15,2; август – 18,1; сентябрь – 17,3; октябрь – 28,0; ноябрь – 31,0; декабрь – 32,3.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Сбербанк».

# Звычайная мужнасць

**Вясковая сям'я выратавала на пажары суседзяў. Мужчына з сынамі-школьнікамі тушыў хату вадой, а жонка нацягнула працівагаз, узяла ліхтарык і здолела выцягнуць з полымя і дыму непрытомную суседку.**



У аграгарадку Іскра Бялыніцкага раёна ў школе адбылася ўрачыстая лінейка, дзе ўшанавалі сям'ю Кісялёвых. Аксана і Уладзімір разам са сваімі сынамі Віталем і Уладзіславам патушылі пажар і выратавалі чалавека.

Пажар у вёсцы Фойна мае прычыны, якія прафесійныя выратавальнікі называюць банальнымі. Напярэдадні Новага года, 30 снежня, два вяскоўцы, мужчына і жанчына сярэдняга ўзросту, выпілі алкаголь і заснулі з непатушанай цыгарэтай. Увечары гаспадар прачнуўся ў задымленай хаце і пабег прасіць ратунку.

— Дзякуючы аператыўным дзеянням суседзяў удалося выратаваць сужыцельку гаспадара, — дакладае начальнік Бялыніцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Станіслаў Бурко, які ўручыў Кісялёвым ліст удзячнасці. — Жанчыну перадалі медыкам, але пацярпела яна няшмат: толькі на 5% цела яна атрымала апёкі 3 ступені. Удалося пазбегнуць чалавечай гібелі на пажары. Сям'я Кісялёвых, іх учынак дастойныя павагі.

Кісялёвы жывуць у вёсцы Фойна ўсё жыццё, адсюль родам і іх бацькі. Маладыя людзі пажаніліся і маюць двух сыноў. Аксана, якой цяпер 30 гадоў, — сацыяльны работнік, а 36-гадовы Уладзімір — механізатар у СВК. Сям'я мае вялікую падсобную гаспадарку.

Заснежаная вясковая вуліца ў Фойне не мае назвы. Жыве тут мала народу, бо шмат пабудоў навокал — лецішчы, якія ўзімку пустуюць. Кісялёвы месцяцца ў цагляным катэджы, праз дарогу наўскос — драўляны дом № 62, які гарэў.

Муж, жонка і дзеці ўзгадваюць падзеі таго вечара. Усе былі дома. Дзеці глядзелі тэлевізар, дарослыя займаліся сваімі справамі, калі прыбег сусед і крыкнуў: «Я гару!»

— Думаць не было часу — мы хутчэй пабеглі і сталі тушыць агонь, — гаворыць Аксана.

Хлопчыкі паказваюць ужо цяпер «гістарычную» калонку:

— Я наліваў ваду, а Віталь падаваў татку вёдры, — гаворыць Уладзік, якому толькі 9 гадоў.

Жонка і муж па чарзе ўзгадваюць, як сусед сказаў, што ўнутры засталася Галіна, яго сужыцелька. Але з хаты валіў чорны, едкі дым ад гарэння шпалер і тканін. Тады 12-гадовы разумнік Віталь узгадаў, што ў доме недзе валяецца працівагаз. Праўда, малога памеру: падышоў толькі жанчыне.

— Я да гэтага ніколі не мела спраў з працівагазам, — прызнаецца Аксана. — А тут усё атрымалася, ды хутка! Узяла ў рукі ліхтарык і пайшла ў хату. Дыму было шмат, але я дыхала нармальна. Муж дапамагаў, збіваў полымя вадой.

Жанчыну Аксана ўбачыла ў свеце ліхтара толькі ў другім пакоі: яна ляжала на падлозе паміж печкай і ложкам, беспрытомная. Яна падцягнула цела да парога, а там ужо «на паветра» вынес муж. Узброеная нашатырным спіртам, Аксана аказала пацярпелай першую дапамогу, выклікала па тэлефоне медыкаў і пажарных. А Уладзімір з сынамі працягваў тушыць пажар, ратаваць дом.

Увесь расповед Кісялёвых умясціўся ў некалькі хвілін, аднак яны не могуць сказаць, колькі рэальнага часу доўжыліся ратавальныя работы на пажары.

— Тады не да часу было, — гаворыць стрыманы Уладзімір. — Трэба было дзейнічаць, каб захаваць жыццё чалавеку ды жыллё. Мы імкнуліся ўсё рабіць хутка, і страшна не было. Але цяпер узгадваць пра тое неяк жудасна, і нават не хочацца.

Не захацеў узгадваць падзеі таго вечара і гаспадар той самай хаты Уладзімір Аўсянікаў. Ён цяпер спрабуе навесці парадак: клеіць сцены і столі газетамі, але пакуль пакоі маюць вельмі сумны выгляд. Усё навокал чорнае, гарэлае. Наступствы пажару, калі на свае вочы, моцна ўражваюць. Ды яшчэ котка, нібыта ўсё яшчэ ў шоку ад пажару, сядзіць нерухома і бліскаючы вачыма з печкі.

— Усё наладзіцца, усё будзе добра, — кажа Уладзімір, які цяпер можа разам са сваёй жанчынай святкаваць другі дзень нараджэння. Вось толькі без небяспечнай цыгарэты ў нецвярозых руках, калі ласка.

Што трэба рабіць, каб засцерагчыся ад пажару, могуць расказаць суседскія школьнікі. Уладзік і Віталь даюць інтэрв'ю журналістам у школьным класе асноў бяспекі жыцця — на фоне стэндаў і малюнкаў аб пажарах. Раней усю гэтую наглядную агітацыю хлопчыкі ўспрымалі як абстракцыю, далёкую ад іх рэальнага жыцця, а цяпер усё іначай.

— Мы пабеглі тушыць пажар проста ў шлёпанцах, толькі вёдры схапілі, — узгадваюць дзеці. — Было трохі страшна. Мы баяліся, што чалавек унутры згарыць, і дом таксама. І страшна было, калі маці пайшла ў хату.

— Не, мы зусім не адчуваем сябе героямі, — кажуць малыя, крыху збянтэжаныя ад усеагульнай увагі да іх.

Увогуле Кісялёвы — сціплыя людзі, якія ўсё паўтаралі, што любы чалавек на іх месцы зрабіў бы тое ж самае. Аднак гэта не ёсць праўда. Станіслаў Бурко расказваў, што нават для прафесійных выратавальнікаў, якія праходзяць спецыяльную падрыхтоўку і ведаюць, што і як трэба рабіць, цяжка зрабіць першы крок у полымя, бо гэта сапраўды страшна.

— Не баяцца толькі дурні, разумныя свой страх пераадольваюць, — казаў начальнік раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. — І скажу вам, што ў нас штогод здараецца, што звычайныя людзі дапамагаюць тушыць пажары і ратаваць ва ўмовах задымлення. Аднак каб маладая жанчына пайшла ў пакой, які быў ахоплены полымем?! Дзе гарэла праводка, апальваліся бярвенні і ад высокай тэмпературы пайшлі расколінамі шыбы? Я лічу, што ўчынак Аксаны Кісялёвай — гэта сапраўдны подзвіг у наш мірны час.

— Калі трэба было зрабіць крок у агонь і дым, я не думала пра рызыку і небяспеку, — прызнаецца жанчына. — Гэта быў шок, і я проста імкнулася ўсімі сіламі выратаваць чалавека. Не меркавала і не разважала, але рабіла. Гэта ўжо потым прыйшоў мандраж. Але я вельмі рада, што ўсё скончылася добра: дзякуй Богу, няхай жанчына жыве!

На ўрачыстай лінейцы ў Іскраўскай школе, дзе вучацца дзеці Кісялёвых, казалі шмат добрых слоў у адрас усёй сям'і. Раённы аддзел адукацыі ўзнагародзіў Віталя і Уладзіслава наборамі для школьнікаў. Намеснік старшыні Бялыніцкага райвыканкама Надзея Серыкава ўручыла Кісялёвым ганаровую грамату ад улад і сказала вялікі дзякуй Аксане і Уладзіміру за тое, што выратавалі чалавечае жыццё і жыллё. Пачулі яны словы падзякі і за выхаванне іх дзяцей. А на заканчэнне — апладысменты для тых, хто прыйшоў на дапамогу людзям.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

*Бялыніцкі раён.*

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Усміхнемся

**Дзяўчына, якая сарвалася з дыеты, да смерці загрызла торт.**

☺

Адэса, цёмны завулак, двое:

— Давай грошы і не думай крычаць!

— Вой, ды што вы! Я нічога не маю супраць таго, каб быць абрабаваным, але ў мяне няма пры сабе грошай. Давайце я вам буду павінен...




☺

**Пры дапамозе абруча і лысага фізрука знаходлівы настаўнік астраноміі паказаў дзецям Сатурн.**

☺

— Зараз ты, як сапраўдны мужчына, проста абавязаны са мной ажаніцца!

— Мілачка, як сапраўдны мужчына, я ўжо даўно жанаты.

**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Калдун. Ялфімаў. Кірмаш. Каюта. Вакса. Суд. Старт. Рыза. Рахунак. Азу. Арышт. Каяк. Значок. Ані. Адліга. Хор. Дах. Дар. Гонар. Ляжак. Дан. Шток. Страла. Дзюба. Ірак. Нара. Алахно. Этажэрка. **Па вертыкалі:** Антрэпрыза. Хлустоў. Вахта. Чардаш. Кантон. Акт. Дока. Кіпр. Каска. Казіно. Нырка. Юра. Юзары. Кабарэ. Яхант. Акат. Астат. Гус. Ядро. Друк. Алідада. Дзея. Гарал. Крах. Нажоўка.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.06 | 17.40 | 8.34 |
| Віцебск — | 9.00 | 17.24 | 8.24 |
| Магілёў — | 8.56 | 17.30 | 8.34 |
| Гомель — | 8.46 | 17.32 | 8.46 |
| Гродна — | 9.20 | 17.56 | 8.36 |
| Брэст — | 9.14 | 18.02 | 8.48 |

**Месяц**
*Маладзік 23 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**
*Пр. Ніны, Адама, Аўсея, Веньяміна, Івана, Ілы, Іосіфа, Ісака, Паўла, Сяргея, Сцяпана.*
*К. Ангелікі, Анелі, Ілоны, Пшэмыслава, Юрыя, Яна.*



Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА.




## Дзве даты

### 27 студзеня

**1499 год** — Мінск атрымаў магдэбургскае права. З гэтага часу кіраўніцтва горада перайшло да магістрату, у склад якога ўваходзіла 12 чалавек на чале з войтам і двума бурмістрамі.



**1756 год** — нарадзіўся Вольфганг Амадэй Моцарт, вялікі аўстрыйскі кампазітар. Ва ўзросце трох гадоў Моцарт лёгка запамінаў асобныя месцы музычных п'ес, якія чуў. Яму было чатыры гады, калі бацька пачаў развучваць з ім некаторыя менуэты. За кароткі тэрмін хлопчык змог выконваць іх з дасканалай чысцінёй і ў строгім рытме. Пяцігадовы Вольфганг складаў маленькія п'есы, якія прайграваў свайму бацьку і прасіў запісваць іх на паперы. А ў шэсць гадоў маленькі музыка ўжо выконваў складаныя творы. За гэты ж час хлопчык авалодаў ігрой на скрыпцы і аргане. Бацьку тым часам распірала жаданне паказаць сваіх таленавітых дзяцей — Марыю Ганну і Вольфганга Амадэя — усяму свету, і Леапольд Моцарт з дачкой і сынам адправіўся ў канцэртнае падарожжа. Яны наведалі Мюнхен, Вену, Парыж, Лондан. Маленькі, худзенькі і бледны шасцігадовы віртуоз, апрануты ў цяжкі, вышываны золатам прыдворны касцюм, у завітым і напудраным парыку, быў падобны на чароўную лялькку. На працягу чатырох-пяці гадзін канцэрта ён іграў на клавесіне адзін і ў чатыры рукі з сястрычкай. Не менш складаныя творы ён выконваў на скрыпцы і аргане. Імправізаваў на зададзеную мелодыю, акампанаваў спевакам незнаёмыя яму творы. Любімай забаўкай публікі была праверка яго слыху. Вольфганг улоўліваў розніцу паміж інтэрваламі ў адну восьмую тона, вызначаў вышыню гуку, узятага на любым інструменце. Ужо тады Вольфганга называлі «цудам XVIII стагоддзя». Геніяльны кампазітар пражыў усяго 35 гадоў, пакінуўшы свету велізарную колькасць выдатных твораў.

## Цытата дня:

*«Калі чалавек ведае, што ідзе да вялікай мэты, то якая б ні была цяжкая дарога, ён не спыніцца, адолее ўсё».*
**Ігнат Дуброўскі, беларускі пісьменнік.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению СПК «Щомыслица» (продавец)**
проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом** объектов недвижимого имущества расположенных по адресу: **Минская область, Минский район, Михановичский с/с, аг. Михановичи**, в составе: **мастерская** (инв. № 600/С-133984), об. пл. 414,8 кв.м; **диспетчерская** (инв. № 600/С-133986), об. пл. 147,4 кв.м; **пункт технического обслуживания** (инв. № 600/С-133992), об. пл. 64,8 кв.м; **гараж** (инв. № 600/С-133990), об. пл. 764 кв.м; **гараж** (инв. № 600/С-133987), об. пл. 731,9 кв.м.

**Начальная цена с НДС – 4 000 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **3,4043 га**
(предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.
Ограничения в использовании:
охранная зона линий электропередач – 0,0600 га;
2-й пояс санитарной охраны подземных источников водоснабжения – 3,4043 га).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by.**

Аукцион состоится **28.02.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.02.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 409. Нумар падпісаны ў 19.30 26 студзеня 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12